Настаўніцкая газета
15 лютага 2020 года

# “Час выбраў нас”

***15 лютага наш народ адзначае 31-ю гадавіну з дня вываду савецкіх войск з Афганістана. Ва ўсіх школах краіны з нагоды гэтай важнай даты праходзяць акцыі памяці, сустрэчы з удзельнікамі “неаб’яўленай вайны”. Адна з іх адбылася ў сярэдняй школе № 16 Ліды. На сустрэчу былі запрошаны воіны-інтэрнацыяналісты Міхаіл Ґенадзьевіч Несцер і Сяргей Піліпавіч Сахань.***

Спачатку прысутным быў паказаны дакументальны фільм пра вайну ў Афганістане, а затым адбылася цікавая гутарка. Вучні наперабой задавалі пытанні гасцям, кожнаму падлетку хацелася пачуць адказ на сваё пытанне. “Ці страшна было на вайне?” — раптам запытаў нехта з хлапчукоў, і ў гэты момант наступіла цішыня. Напэўна, многія думалі пачуць кароткае “не”, але Сяргей Піліпавіч прыцішаным голасам сказаў: “Страшна”. Пасля дадаў: “Не хацелася паміраць, бо большасці з нас было ўсяго па дваццаць гадоў, а яшчэ страшней было бачыць, як гінуць твае сябры. Але мы выконвалі свой абавязак. А тое, што мы былі на вайне, то гэта час быў такі, час выбраў нас”.

Гадзіна сустрэчы праляцела непрыметна, потым дзеці доўга яшчэ не адпускалі гасцей. Мы, цяперашнія вучні, настаўнікі і бацькі, верым, што гэтая вайна была апошняй, што ні адзін беларускі салдат больш не будзе ваяваць на тэрыторыі чужой дзяржавы.

**Таццяна ЖВАЦЕЛЬ,**
**настаўніца беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 16 Ліды.**